**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”**

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

**Філічонак**

**Надзеі Віктараўны**

# Структурна-зместавыя асаблівасці “Беларуска-расійскага слоўніка” Яна Станкевіча

**Дыпломнае даследаванне**

**Навуковы кіраўнік –**

**кандыдат філалагічных навук,**

**дацэнт Ржавуцкая М.С.**

**Мінск, 2013**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РЭЗЮМЭ

**Філічонак Надзеі Віктараўны**

**“Структурна-зместавыя асаблівасці “Беларуска-расійскага слоўніка” Яна Станкевіча”**

Дыпломнае даследаванне прысвечана сістэмнаму аналізу структурных частак і асаблівасцей зместу лексікаграфічнай працы Яна Станкевіча “Беларуска-расійскага (Вялікалітоўска-расійскага) слоўніка” (1990г.).

**Аб’ект даследавання –** лексікаграфічная праца Яна Станкевіча.

**Прадмет даследавання** – спецыфіка структуры і адметнасці зместу “Беларуска-расійскага (Вялікалітоўска-расійскага) слоўніка” Яна Станкевіча.

**Мэта даследавання** – аналіз, сістэматызацыя і апісанне структурна-зместавых асаблівасцей слоўніка.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў апісанні структурных і зместавых асаблівасцей “Беларуска-расійскага слоўніка” Яна Станкевіча”. Вызначаецца яго мегаструктура (узаемаразмяшчэнне асобных частак выдання), макраструктура (парадак размяшчэння рэестравых слоў (лем)) і мікраструктура (будава і пералік звестак, якія выкарыстоўваюцца ў слоўнікавых артыкулах).

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы дыпломнай работы могуць быць выкарыстаны ў далейшым даследаванні “Беларуска-расійскага (Вялікалітоўска-расійскага) слоўніка” Яна Станкевіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ